УДК 374.7

# Модульны спосаб пабудовы культурных тэкстаў

Анцыповіч М. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Модульнасць – новы падыход у менэджменту, кіроўны прынцып арганізацыі складаных тэхналогій, калі вытворчасць канчатковага прадукта разбіваецца на асобныя падсістэмы, паслядоўнасць якіх здольна вар’іравацца, што дазваляе стандартызаваць складаныя вытворчасці зніжаючы кошты канчатковага прадукта.

З канца XX стагоддзя модульны спосаб выяўляецца ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства: сацыяльных адносінах, метадах пазнання, менэджменце, мастацкай культуры.

Модульнасць сацыяльных адносін на ўзроўні індывідыўма праяўляецца ў свабодзе ім выбара і магчымасці выконваць розныя сацыяльныя ролі. Замест жорсткай прывязанасці да канкрэтнай сацыяльнай групы традыцыйнага і індустрыяльнага грамадства сучасны чалавек развівае адносіны на аснове дыфузных сацыяльных сувязяў, якія фарміруюцца праз інтэрнэт і мабільныя прыстасаванні.

Модульны спосаб пабудовы культурных тэкстаў дазваляе адаптаваць іх сэнсы да зменлівай сацыяльнай рэальнасці, напаўняе культурны тэкст новымі сэнсамі і значэннямі ва ўмовах інтэнсіфікацыі і рацыяналізацыі сацыякультурных адносін сучаснага грамадства.

У мастацкай культуры модульнасць **функцыянуе на аснове прынцыпа заменнасці яе складнікаў і** праяўляецца як сродак павышэння эканамічнай мэтазгоднасці. Модульнасць літаратурных твораў спрыяе магчымасці іх публікацыі ў перыядычным друку, калі пры паспяховасці папярэдніх частак публікуюцца наступныя часткі, вытворчасць якіх суадносіцца з фінансавай карыснасцю. Модульнасць спрыяе фармаванню нелінейнага ўспрыняцця культурных тэкстаў, які забяспечвае інтэнсіфікацыю ўзаемадзеянне чалавека з інфармацыяй.

Нелінейнасць рэалізуецца пры наяўнасці блокаў – модуляў, якія ўтвараюць пэўную сістэму, але якія зберагаюць аўтаномнасць ў адносінах да гэтай сістэмы, што дазваляе здзейсніць непаслядоўныя пераходы ад аднаго блока да другога, без нанясення функцыянальнай шкоды для работы ў цэлым. Модульны спосаб арганізацыі культуры тэкста ў розных сферах жыццядзейнасці спрыяюць фармаванню прадуктыўных стратэгій пераадольвання выклікаў ва ўмовах сучасных сацыякультурных трансфармацый.

Модульны спосаб пабудовы культурных тэкстаў выяўляецца ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства ў сучасных умовах.